**А ў крывога танка, да не выведу канца**

Карагод тыпу “крывы танок”

А ў крывога танка, да не выведу канца.
Нада яго да выводзіці, канца ладу ізнаходзіці,
Нада яго весці, шоб вяночык сплесці.
Вяду, вяду, да не выведу, пляту, пляту, да не выпляту.
Ой, вянку ж мой вянку, храшчатый барвінку,
А я ж цябе пляла, шчэй учора із вячора,
Павесіла цябе на роўным калочку,
На роўным калочку, на шаўковым шнурочку.
А ў крывога танка, да выведу канца.

Водзяць змейкай вакол трох групак дзяўчатак.

Запісаў Басаў Р.Ц. у 2006 г. у в. Гадзічава ад Зайцавай Анастасіі Нікіфараўны 1926 г.н., Лапека Варвары Агееўны, 1910 г.н., Зайцавай Марыі Іванаўны, 1921 г.н., Лаўровай Марыі Нікіфараўны, 1924 г.н., Басавай Таццяны Сяргееўны, 1934 г.н., Зайцавай Марыі Андрэеўны, 1937 г.н.